8. *Манхейм К.* Диагноз нашего времени / Пер. с англ. — М., 1994.
9. *Иванов В.* Социальные технологии в современном мире. — М., 1996.

М.А.Бяспалая,
*прафесар*

# КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВЁСКІ ў 1920-я гады: ПЫТАННІ І ПРАБЛЕМЫ

У гістарычнай навуцы савецкага і постсавецкага перыядаў замацаваўся выразны стэрэатып разгляду культурнага жыцця вёскі ў паслярэвалюцыйны перыяд: падрабязнаму аналізу падлягала партыйная палітыка ў галіне культуры, мала ўвагі звярталася на адраджэнне і развіццё нацыянальнай культуры, па-за ўвагай навукоўцаў засталася культурная сітуацыя ў вёсцы.

Па прычыне вядомых гістарычных абставін шмат стагоддзяў вёска з'яўлялася адзіным носьбітам народнай культуры, якая, як вядома, складае аснову нацыянальнай культуры. Рэвалюцыя ж прынесла з сабою новую культуру, падпарадкаваную перш за ўсё палітычным мэтам. Працэс яе пашырэння праз палітыка-асветныя ўстановы не знайшоў пакуль выразнага асвятлення, хаця аналіз архіўных дакументаў выклікае неабходнасць пастаноўкі наступных пытанняў: як суадносіліся традыцыйная народная культура і палітычнае асветніцтва, як палітасветніцтва ўспрымалася сялянствам, хто з'яўляўся яго носьбітам.

Стэрэатыпнымі з'яўляюцца накірункі, па якіх разглядалася культурнае жыццё гэтага перыяду: ліквідацыя непісьменнасці, беларусізацыя, тэатральнае мастацтва, кіно і ў апошнюю чаргу палітыка-асветніцкая работа. На наш погляд, незаслужана абходзіцца гісторыя станаўлення палітасветработы на вёсцы. У выніку сённяшняе пакаленне пазбаўлена магчымасці разглядаць гістарычны працэс з пазіцыі вясковага жыхара, а не з афіцыйнай, адшліфаванай у шматлікіх пастановах. Не акцэнтуецца ўвага на вывучэнне сітуацыі 1921—1923 гг., калі адбываліся пошукі зместу палітасветработы і станаўленне яе структуры, наступнага перыяду, 1924—1927 гг., калі былі вызначаны задачы і метады палітыка-асветніцкай работы на вёсцы.

Неабходна прызнаць, што палітычнай асвеце дарослых дзяржава надавала вялікую ўвагу. Падрастаючае пакаленне



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ідэалагічна магло выхоўвацца ў школе, з астатнім насельніцтвам было складаней. Павярнуць велізарную колькасць людзей на шлях, вызначаны Камуністычнай партыяй, савецкая ўлада спадзявалася з дапамогай спецыяльна створанай структуры. Яшчэ падчас грамадзянскай вайны на тэрыторыі, свабоднай ад баявых дзеянняў, сталі ўзнікаць першыя вясковыя палітыка-асветныя ўстановы — хаты-чытальні. Аднак, па прызнанні Н.К.Крупскай, "на арганізацыю іх быў патрачаны не адзін мільён, а вынікаў не адчуваецца". На яе думку, "адна з прычын такой з'явы — незацікаўленасць насельніцтва, ігнараванне ім новых установ" (1). У апошнія месяцы грамадзянскай вайны аддзелы народнай асветы, у веданні якіх знаходзілася масавая работа сярод дарослых, зноў вярнуліся да ідэі стварэння на вёсцы хат-чытальняў. Яна была падтрымана вясковымі актывістамі. У большасці выпадкаў камсамолец ці былы чырвонаармеец аб'яўляў сваю хату чытальняй, на яе адрас выпісвалася газета, і гэтым справа канчалася. Праз некаторы час большасць з такіх установ перастала існаваць (2).

Важным этапам у станаўленні палітасветсістэмы стала Першая Усерасійская нарада палітасветаў, якая адбылася ў лістападзе 1920 г. Яе рашэнні прадугледжвалі стварэнне Галоўнага камітэта палітычнай асветы (Галоўпалітасвета) і адпаведнай нізавой структуры. Дарэчы, з гэтага часу і да 1946 г. работа сярод дарослых і адпаведныя ўстановы называліся палітыка-асветнымі, што выразна адлюстроўвае іх задачы, асноўны змест дзейнасці. На вёсцы па-ранейшаму галоўная роля адводзілася хатам-чытальням. Каб уявіць памеры вясковай сеткі палітасветустаноў, спашлемся на даныя Галоўпалітасвета рэспублікі за 1927 г., калі дзейнічалі 97 народных дамоў і 307 дзяржаўных хат-чытальняў (3). Акрамя апошніх, існавалі шэфскія і створаныя па ініцыятыве камсамольскай моладзі хаты-чытальні. У справаздачах іх называлі дагаворныя, нясеткавыя. Іх колькасці назваць немагчыма, таму што яны ўзнікалі спантанна і хутка знікалі. Мабыць, наяўнасць розных даных і стала асноўнай прычынай з'яўлення ў навуковых працах разнастайных лічбаў колькасці палітыка-асветных установ.

Неабходна заўважыць, што сярод дзяржаўна-партыйнага кіраўніцтва Беларусі праявіліся дзве тэндэнцыі ў падыходзе да культурнага будаўніцтва: арыентацыя на нацыянальныя каштоўнасці і традыцыі і наданне прыярытэту новай, пралетарскай культуры. Працэс нацыянальна-культурнага адраджэння прадугледжваў пашырэнне ўжывання беларускай

мовы, ліквідацыю непісьменнасці, развіццё нацыянальнай літаратуры, тэатра, мастацтва. З'яўляючыся часткай РКП(б), Кампартыя Беларусі павінна была падтрымліваць ідэалагічную лінію. З-за непісьменнасці беларускай вёскі менавіта яна апынулася пад актыўным уздзеяннем партыйнай ідэалогіі і новай пралетарскай культуры, якую прапагандавалі паліттыка-асветныя ўстановы.

Праблема ўкаранення новай культуры ў вясковае асяроддзе аказалася даволі складанай. Па-першае, вёска была малапісьменнай, таму ўспрымаць партыйную прапаганду ў пажаданым аб'ёме не магла; па-другое, у Беларусі асноўная частка насельніцтва пражывала на вёсцы, таму не хапала ні сродкаў, ні кадраў; па-трэцяе, на вёсцы вельмі моцна трымаліся традыцыйная народная культура, паданні, вераванні, і хутка пераадолець іх аказалася немагчыма. Яшчэ адзін важны момант абмяжоўваў пранікненне новай культуры — незадаволенасць сялянства дзяржаўнай эканамічнай палітыкай. Негатыўныя адносіны да эканамічных эксперыментаў пераносіліся і на афіцыйную работу. Ва ўмовах незадаволенасці вёскі выйсце бачылася ў пашырэнні агітацыі за лінію партыі.

Выцесніць з народнай свядомасці "контррэвалюцыйныя" звычаі, выхоўваць сялянства ў рэчышчы партыйнай ідэалогіі належала ўстановам паліттасветы. У маі 1924 г. старшыня ГПА А.Лысаў на Мінскай і Бабруйскай павятовых канферэнцыях паліттасветработнікаў гаварыў: "Хата-чытальня павінна стаць царквою вёскі, а хатнік — чырвоным папом. Яна з'яўляецца культурным цэнтрам, і не трэба чакаць, пакуль прышлюць тыя ці іншыя заданні" (4). Аднак восенню 1924 г. канстатуецца, што "асветная работа на вёсцы не ўвязваецца з агульнапалітычнымі задачамі, мае невыразныя формы, работа ўсіх асветных структур вядзецца няўзгоднена" (5). Па гэтай прычыне задачы паліттасветустаноў былі акрэслены больш канкрэтна: стварэнне сялянскага актыву, узмацненне сувязі партыі з сялянствам, процідзеянне ўсім спробам кулацтва ідэалагічна ўздзейнічаць на вёску, наданне рабоце хаты-чытальні "баявога характару" (6).

Ці маглі справіцца з гэтай складанейшай задачай нешматлікія хаты-чытальні і народныя дамы? Адказ можа быць толькі адмоўны. Па-першае, адна хата-чытальня абслугоўвала ад 7 тыс. чалавек (Мінская акруга) да 10 тыс. (Магілёўская і Аршанская акругі) (7). Па-другое, хаты-чытальні ўяўлялі сабой сумнае відовішча. Толькі 45% (па другіх звестках 23%) знаходзіліся ў сваіх будынках,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12% — у адным памяшканні з сельскім Саветам, астатнія — у сялянскіх хатах (8). У справаздачы Мінскага акруговага палітасвета канстатавалася: “Зімовы перыяд 1924/25 г. для многіх хат-чытальняў аказаўся вельмі цяжкім. У некаторых раёнах яны засталіся без дроў і святла, з-за адсутнасці сродкаў не маюць дастаткова мэблі. У большасці хаты-чытальні брудныя, няўтульныя, некаторыя па сваім знешнім выглядзе ўбогія і не прыцягваюць наведвальнікаў” (9). Па-трэцяе, вострай праблемай заставалася кадравая. Большасць загадчыкаў сельскіх палітасветустаноў з’яўляліся партыйцамі або камсамольцамі. Згодна з афіцыйнымі справаздачамі, члены КП(б)Б складалі 13,7%, кандыдаты — 18, члены КСМБ — 45,5, беспартыйныя — 22,8% (10). Безумоўна, лічбы не могуць быць дакладнымі па прычыне значнай бягучасці кадраў і недасканаласці статыстыкі. Што тычыцца агульнаадукацыйнага ўзроўню, то большасць загадчыкаў народных дамоў і хат-чытальняў Мінскай акругі мелі пачатковую адукацыю (11). Па-чацвёртае, дрэннае матэрыяльнае забеспячэнне хатнікаў, аклад якіх вагаўся ў межах 12—26 рублёў, хаця згодна з урадавымі пастановамі павінен быў раўняцца зарплаце настаўніка — 30—36 рублёў у месяц, садзейнічаў прыметнай бягучасці кадраў. Напрыклад, у Магілёўскай акрузе з 40 работнікаў толькі трое мелі стаж чатыры гады, 13 чалавек — два гады, адзін — тры гады і 23 хатнікі працавалі менш года (12). Па-пятае, нягледзячы на складаныя задачы, якія ставіліся перад палітасветустановамі, адносіны да іх з боку кіруючых інстанцый уяўлялі “другую ступень важнасці”, па выразе аднаго з хатнікаў. Вышэйшыя органы патрабавалі ад падначаленых штомесяц даваць аб’ёмныя справаздачы, рэгулярна “закручвалі гайкі” і высвятлялі “фактычнае становішча” замест метадычнай і маральнай дапамогі.

З-за адзначаных прычын вясковыя палітасветустановы былі прадастаўлены самі сабе. Галоўпалітасвету даводзілася канстатаваць, што “работа ідзе па лініі найменшага супраціўлення, ладзяцца спектаклі і танцулькі” (13). Наркам асветы А.Баліцкі досыць трапна назваў хаты-чытальні “тапталам моладзі”. Кіраўніцтва акруговага і раённага ўзроўняў звяртала ўвагу на невыразнасць і неакрэсленасць формаў палітасветработы. Прызнавалася, што “папулярныя даклады і лекцыі абмяжоўваюцца толькі агульнымі разважаннямі, з якіх селянін, думаючы канкрэтна і выразна, нічога не атрымоўвае. Даклады не ўлічваюць інтарэсаў асобных груп насельніцтва, чытаюцца масам...” (14).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Па гэтай прычыне адпаведныя арганізацыі з 1924 г. прыступілі да распрацоўкі праграм і праспектаў папулярных лекцый па сельскай гаспадарцы, медыцыне, антырэлігійнай тэматыцы. На іх правядзенне ніякіх сродкаў не выдзялялася, можна было разлічваць толькі на энтузіястаў накшталт працаўнікоў асветы з Сёмкава-Гарадоцкай воласці, якія пастанавілі: "Прысутнічаць на кожным сельскім сходзе і, па магчымасці, ставіць на павестку дня свае пытанні па грамадскіх навуках, прыродазнаўстве, сельскай гаспадарцы, санітарнай гігіене і інш. Такіх лекцый павінна быць не менш двух у месяц" (15).

Сярод іншых формаў палітыка-асветніцкай работы перавага аддавалася арганізацыі разнастайных гурткоў, чырвоных куткоў пры школах, кааператывах, сельсаветах, саўгасах, камунах. Аднак з многіх месцаў паведамлялі, што "гурткі працы не разгарнулі. У некаторых праводзяцца гутаркі, але яны не зацікавілі дарослых сялян. Хатнікі не ўмеюць арганізаваць працу" (16). Афіцыйная прапаганда з 1924 г. пачала насаджаць ідэю арганізацыі пры хатах-чытальнях самых разнастайных куткоў: ленінскага, санітарнага, ваеннага, мопраўскага, бязбожніка, батрака і інш. Справа настолькі актывізавалася, што адзін з кіраўнікоў ГПА заявіў: "Усе патрабуюць куток у хаце-чытальні. Я не разумею, які куток патрэбны для батракоў" (17).

Як самыя практычныя і даступныя формы работы раілася праводзіць галосныя чытанні і гутаркі сярод сялян. У справаздачах некаторых хатнікаў паведамлялася аб "чытках сялянам газет на прызбе", "групавой агітацыі на вячорках і сялянскіх курылках" (18). У 1924 г. з'явілася некалькі артыкулаў Н.К.Крупскай аб вялікім значэнні для сялян даведачнай працы, і з восені пачалі стварацца даведачныя сталы пры хатах-чытальнях. Хатнікі павінны былі па просьбе сялян пісаць заявы, даваць вусныя тлумачэнні па пытаннях зямельнай і падатковай палітыкі, крымінальных і сямейных справах і інш. Яны неслі прамую адказнасць у выпадку "масавага спазнення з аспрэчваннем няправільнага абкладання, з заявамі аб ільготах" (19). У 1927 г. Наркамат юстыцыі праверыў работу некаторых даведачных сталоў і прыйшоў да высновы "аб іх малой карысці" (20). Не знайшла падтрымкі сярод кіраўніцтва Наркамата асветы, у структуру якога ўваходзілі органы палітасветы, ідэя аб адкрыцці паштовых аддзяленняў, а сярод сялянства — прапанова аб стварэнні ашчадных кас пры хатах-чытальнях.

Працягвала ўжывацца і такая форма масавай работы, як правядзенне кампаній, змест якіх мяняўся адпаведна зменам прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі. Аднак згодна з паведамленнямі з месцаў сялянства праяўляла зацікаўленасць толькі ў тым выпадку, калі змест кампаній тычыўся вёскі і яе праблем. Менавіта па гэтай прычыне ў кастрычніку 1926 г. было прынята рашэнне “скараціць да мінімуму ўсялякія дні, кампаніі, за выключэннем тых, якія маюць адносіны да вёскі (Дзень ураджаю, Дзень лесу, перавыбары сельсаветаў)” (21). Вялікая колькасць самых разнастайных кампаній цяжкім грузам клалася на хаты-чытальні і актывістаў. Яны праводзіліся шаблонна, нецікава. “Насельніцтва ўжо менш цікавіцца нашымі святамі, з вопыту мінулых гадоў ведаючы, — канстатавалася ў адным з афіцыйных дакументаў, — што ў іх будзе — урачысты сход, дэманстрацыя, спектакль. Яшчэ горшая справа з масавымі кампаніямі, таму што кожная з іх уносіць руйнаванне ў працу хаты-чытальні” (22).

Не менш важнае і цікавае пытанне аб стаўленні вёскі да новай культуры, аб тым асяроддзі, якое падтрымлівала афіцыйную культурную палітыку, садзейнічала яе ўкараненню і распаўсюджанню. Безумоўна, існавала праслойка людзей, якія рабілі гэта з прычыны займаемай пасады. Найбольш успрымальным асяроддзем для новай культуры аказалася частка вясковай моладзі, якая шчыра паверыла ў лозунгі савецкай улады, у магчымасць жыць лепш пры іх ажыццяўленні. Спашлемся на слушную, на наш погляд, заўвагу А.Хоцінай наконт “маладнякоўцаў”: “Яны ўспрынялі рэвалюцыю як сваё кроўнае, марксізм-ленінізм лічылі вяршыняй дасканаласці і, нават не засвоіўшы лепшых дасягненняў сусветнай культуры, шырока размахнуліся” (23). Недастатковасць адукацыі, адсутнасць палітычнай культуры, шматабяцальная перспектыва савецкіх міфаў сталі галоўнымі ўмовамі фарміравання сацыяльнага асяроддзя, на якое ўлада магла разлічваць. Па сведчанні сучаснікаў, “камсамол стаў праваднікам новых ідэй у самую гушчу сялянскіх сямей і па характары сваёй работы ламае вельмі многа ў старым сялянскім быце” (24). У выніку можна канстатаваць, што ўспрыманне часткаю моладзі савецкай палітыкі прывяло да расколу ў сялянскіх сем’ях на ідэалагічнай аснове, што яшчэ больш ускладніла сацыяльна-псіхалагічны стан вёскі.

Прывабіць вясковых жыхароў працаю хаты-чытальні аказалася вельмі складана. “Зацікаўленасць насельніцтва толькі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пачынаецца, — гаворыцца ў адным з дакументаў. — Самі хаты-чытальні не знаёмяць яго са сваёю работаю і не робяць справаздач. Пастаянным наведвальнікам з'яўляецца моладзь, якая цікавіцца толькі гульнямі. Наведванне хаты-чытальні грамадзянамі з другіх вёсак бывае ў тых выпадках, калі трэба пісаць заяву. Наведвальнікі дзеляцца на тры групы: група ў 5—10 чалавек старэйшага ўзросту ў вольны час цікавіцца мерапрыемствамі і гутарыць; грамадзяне прыходзяць у сельсавет і заходзяць у хату-чытальню даведацца навіны; грамадзяне пасля службы ў царкве звычайна збіраюцца каля хаты-чытальні, і гэты момант выкарыстоўваецца для чыткі газет" (25).

Не карысталіся павагай сялянства і многія з хатнікаў. Праўда, у некаторых месцах яны так часта мяняліся, што насельніцтва не паспявала пазнаёміцца з чарговым загадчыкам. У некаторых дакументах указваецца, што "хата-чытальня працуе зусім слаба з прычыны неаўтарытэтнасці і непадрыхтаванасці хатніка" (26).

Дзеля таго каб пераадолець негатыўныя моманты ў адносінах вёскі да палітыка-асветніцкай работы, кіруючыя інстанцыі ў кастрычніку 1927 г. раілі: "У агітацыйнай рабоце сярод сялян неабходна аб'ядноўваць агульнапалітычныя моманты з канкрэтнымі мясцовымі пытаннямі, каб сходы сялян мелі, акрамя палітычных мэт, і характар рабочых нарад, якія прымаюць пад кіраўніцтвам партыі рашэнні практычнага зместу" (27).

На падставе вышэйпрыведзеных фактаў можна канстатаваць, што вёска аказалася сам-насам з новай культурай. Усё, што апошняя прапаноўвала, для большасці вяскоўцаў аказалася новым, але чужым і непатрэбным. І хаця ў партыйных дакументах адзначалася, што "хаты-чытальні больш выразна ўвасабляюць у сваёй працы пастановы Камуністычнай партыі па перабудове вёскі, больш яскрава праводзяць класавы падыход" (28), але кіраўніцтва Наркамата асветы было настроена менш аптымістычна. Наркам А.Баліцкі лічыў, што "асветніцтва не змагло за кароткі тэрмін савецкай улады цалкам ліквідаваць цяжкую спадчыну..." (29).

Актыўнаму наступу культурнай рэвалюцыі сялянства процістаўляла сілу традыцый, маральна-этычных нормаў і правілаў, выпрацаваных стагоддзямі. Праўда, гэтым пранікненне новай культуры на вёску спынена не было. Наадварот, з умацаваннем пазіцыі савецкай улады фарміраваўся сацыяльны фундамент будучых пераўтварэнняў — на вёсцы ў асноўным гэта было маладое пакаленне.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці* (ДА МВ), ф. 323, воп.1, спр.134, л.25.
2. *Там жа*, ф.324, воп.1, спр.150, л.67.
3. *Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь* (НА РБ), ф.4, воп.7, спр.136, л.149.
4. *НА РБ*, ф.42, воп.1, спр.927, л.14.
5. *Там жа*, ф.4, воп.3, спр.11, л.62.
6. *Там жа*, ф.306, воп.1, спр.197, л.63.
7. *Там жа*, ф.4, воп.7, спр.136, л.149.
8. *Там жа*, спр.186, л.15.
9. *Там жа*, ф.101, воп.1, спр.1277, л.35.
10. *Там жа*, ф.306, ф.1, спр.64, л.141.
11. *Там жа*, ф.4, воп.3, спр.197, л.66.
12. *Там жа*, ф.306, воп.1, спр.159, л.74, 75.
13. *Там жа*, ф.4, воп.3, спр.5, л.40.
14. *Там жа*, ф.101, воп.1, спр.2175, л.39.
15. *Там жа*, ф.4, воп.3, спр.11, л.62.
16. *Там жа*, ф.306, воп.1, спр.197, л.28.
17. *Там жа*, спр.158, л.643.
18. *Там жа*, ф.5, спр.216, л.38.
19. *Там жа*, ф.306, воп.1, спр.108, л.304.
20. *Там жа*, ф.4, воп.7, спр.137, л.27.
21. *Там жа*, ф.306, воп.1, спр.159, л.67.
22. *Там жа*, ф.4, воп.7, спр.50, л.377.
23. *Хоціна А.І.* Да пытання аб канцэпцыі нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў 20—30-я гады // Веснік БДУ. Сер.3.— 1994.— №2.— С.4.
24. *Алуф А.* Белорусская деревня // На аграрном фронте.— 1925.— №5-6.— С.170.
25. *НА РБ*, ф.101, воп.1, спр. 1277, л. 16.
26. *ДА МВ*, ф.320, воп.1, спр. 208, л. 152.
27. *НА РБ*, ф.4, 6, 7, спр.50, л. 377.
28. *Там жа*, ф.42, воп.1, спр.1841, л. 2.
29. *Баліцкі А.* Культурнае будаўніцтва Савецкай Беларусі да X гадавіны аглашэння БССР // Асвета.— 1928.— №8.— С.5.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ